© 2021 Katedra Białorutenistyki UW. Wydanie w otwartym dostępie na licencji **CC BY-NC-ND** (https://creativecommons.org/licenses/by-nc-nd/4.0/deed.pl)

ACTA ALBARUTHENICA 21: 2021
DOI: 10.32612/uw.18988091.2021.21.pp.135–150

Алена Рудэнка / Alena Rudenka

незалежны даследчык / independent researcher
ORCID: 0000-0002-1165-3299
e-mail: alena@rudenka.com

Уплыў польскай мовы на раннія ўсходнеславянскія граматы Вялікага Княства Літоўскага

The influence of the Polish language on the early East Slavic acts of the Grand Duchy of Lithuania
Wpływ języka polskiego na wczesnosłowiańske akty Wielkiego Księstwa Litewskiego

Існуюць розныя версіі ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага; яны коратка ахарактарызаваны ў кнізе Пятра Чыгрынава [Чигринов 2000: 46 і наступн.]. У савецкіх падручніках па гісторыі Беларусі і ВКЛ ўзнікненне і хуткі тэрытарыяльны рост княства на першых этапах існавання трактаваўся звычайна як ваенная экспансія этнічных балцкіх плямёнаў на спрадвечныя славянскія землі [Пашуто 1959; Шабульдо 1987]. У вядомай кнізе Міколы Ермаловіча [Ермаловіч 1989] прапануецца іншая версія, падтрыманая ў пазнейшых даследаваннях аб пачатковым этапе развіцця ВКЛ [гл.: Ермаловіч 2003; Краўцэвіч 2013].

Вялікае Княства Літоўскае ўзнікла на тэрыторыі сучаснага беларускага Панямоння (гістарычная Літва). У 30–40х гг. XIII ст. Наваградскае (Новагародак – сучасны беларускі горад Навагрудак) княства з першым князем Міндоўгам стала хутка расці, далучаючы зямлі навакольных балцкіх і славянскіх княстваў. Згодна з А. Краўцэвічам,

> назва Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае адлюстроўвае тры асноўныя тэрытарыяльныя складнікі дзяржавы, а чарговасць іх пераліку – храналагічны парадак далучэння да ядра – цэнтральнай вобласці дзяржавы – Літвы (складалася з Наваградчыны, Гарадзеншчыны, Віленшчыны і заходняй часткі Міншчыны); Русі, г. зн. Беларускага Падзвіння, Падняпроўя, Палесся ў XIII–XIV стст.; Жамойці – у XV ст. Пад акрэсленне “Рускае” траплялі таксама ўкраінскія землі, далучаныя ў XIV ст. [Краўцэвіч 2013: 7].

Хуткай кансалідацыі славянскіх земляў вакол Навагародка спрыяла пагроза нашэсця рыцарскіх ордэнаў і ордаў Батыя.

Княская ўлада і развіццё дзяржавы ў ВКЛ рэалізоўваліся тымі ж шляхамі, што і ў Маскоўскай Русі: інтрыгі, унутрысямейныя звады, забойствы, міжусобныя войны і саюзы. Пра гэта гаворыцца ў адной з першых згадак пра літоўскіх князёў у Галіцка-Валынскім летапісе:

> Въ лѣто 6723. Божиимъ повелениемь прислаша князи Литовьскии к великой княгини Романовѣ и Данилови и Василкови, миръ дающе. Быху же имена литовьскихъ князей се: старѣшей Живинъбудъ, Давъятъ, Довъспрункъ, братъ его Мидогъ, братъ Довъяловъ Виликаилъ. А жемотьскыи князи: Ерьдивилъ, Выкынтъ, а Рушьковичевъ – Кинтибуть, Вонибут, Бутовить, Вижѣикъ, и сынъ его Вишлий, Китений. Пликосова, а се Булевичи – Вишимут, егоже уби Миндого тъ, и жену его поялъ, и братью его побилъ, Едивила, Спрудѣйка, А се князи из Дяволтвы: Юдьки, Пукѣикъ, Бикши, Ликиикъ. Си же вси миръ даша князю Данилови и Василку, и бѣ земля покойна. Ляхом же не престающимъ пакостящимъ, и приведе на ня литву, и воеваша ляхы, и много убиства створиша в нихъ [*Галицко-Волынская летопись* online].

Тэкст мірнай дамовы паміж Галіцка-Валынскім і Літоўскім княствамі, згаданы ў летапісе, не захаваўся, але звесткі пра яго з'яўляюцца першай згадкай у рускіх летапісах аб Міндоўгу – заснавальніку Літоўскай дзяржавы, якая пачала збіраць вакол Навагародка зямлі ўдзельных навакольных княстваў.

Тэрмін Паўднёва-Заходняя Русь, ці Паўднёва-Заходнія Рускія зямлі, мае розны змест у залежнасці ад гістарычнага перыяду. У часы Кіеўскай Русі (X–XII стст.) так называюцца Чырвоная Русь і Галіцка-Валынскае княства. Пасля аслаблення Кіева і ў часы Залатой Арды (XIII–XV стст.) гэты тэрмін абазначае рускія землі пад эгідай ВКЛ і Польшчы. Пасля Люблінскай уніі (з XVI ст.) так сталі называцца толькі рускія землі, якія перайшлі да Польшчы (цяперашняя Украіна). У дамангольскім 1237 годзе гэта былі амаль поўнасцю сем рускіх княстваў, а менавіта: Кіеўскае, Валынскае, Полацкае, Пераяслаўскае і Турава-Пінскае, а таксама часткова Чарнігаўскае і Смаленскае княствы. Паняцце Паўднёва-Заходняя Русь гэткае ж традыцыйнае, як і паняцці Белая, Чорная, Чырвоная Русь, якія абазначаюць пэўныя гістарычныя ўсходнеславянскія вобласці.

Як адзначалася вышэй, Маскоўская (Вялікая) Русь і Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае развіваліся падобным чынам: абедзве дзяржавы ставілі перад сабой задачу збірання рускіх зямель. Аднак падобнасць лёсаў не азначала іх тоеснасць – былі і адрозненні, напрыклад, ВКЛ мела мацнейшую празаходнюю арыентацыю. Пры гэтым у самім Вялікім Княстве Літоўскім розныя этнасы і розныя гістарычныя вобласці моцна адрозніваліся. Не закранаючы шырокую і скла-

даную праблему этнічнага складу ВКЛ, спынімся на продках беларусаў і ўкраінцаў.

Калі практычна ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі належала Вялікаму Княству Літоўскаму, то з украінскімі тэрыторыямі ўсё было інакш. Як вядома, пасля распаду Кіеўскай Русі (882–1240) на ўдзельныя княствы і руйнавання Кіева Батыем (1240) статус палітычнага і культурнага цэнтра перайшоў ад Кіеўскага княства да Галіцка-Валынскага (1199–1392). Менавіта там найбольш актыўна развіваліся далей усе пісьмовыя стылі і жанры, у тым ліку і дзелавая пісьменнасць: у прыватнасці, у граматах, як і раней, выкарыстоўваўся візантыйска-старажытнарускі фармуляр і ўпершыню з'явіліся ўкраінскія рысы.

Васіль Русаніўскі піша:

> У канцы XIV ст. украінскія землі ўваходзілі ў склад некалькіх дзяржаў. Большая частка тэрыторыі Украіны, а менавіта: Кіеўшчына і Пераяслаўшчына, Чарнігаўшчына, Валынь і паўночна-ўсходняе Падолле – ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Галіцыя і паўднёва-заходняе Падолле былі захоплены Польшчай, частка падольскіх і галіцкіх земляў (Букавіна) адышлі да Малдаўскага княства, Закарпацце было пад уладай венгерскіх каралёў [Русанівський online].

З гэтай прычыны беларусы цалкам ідэнтыфікуюць сваю гісторыю з ВКЛ, а ўкраінцы – толькі ў пэўнай ступені.

Розніца ў тэрытарыяльнай прыналежнасці была не адзінай і не галоўнай. Беларускія землі мелі больш выразную еўрапейскую арыентацыю; апрача традыцыйнага праваслаўя тут былі шырока распаўсюджаныя каталіцтва, пратэстантызм і інш. Славутая беларуская талерантнасць карэніцца менавіта ў шматэтнічнасці і шматканфесіянальнасці ВКЛ. Украінскія землі (за выключэннем Закарпацця) па тэрытарыяльна-гістарычных умовах імкнуліся да ўсяго "рускага": праваслаўя і руска-візантыйскай культурнай традыцыі. У канчатковым выніку гэта стала адной з прычын добраахвотнага далучэння да Маскоўскай Русі. На розніцу менталітэту украінцаў і беларусаў указвае (у сувязі з Хмяльніччынай) і Генадзь Сагановіч: „Розніца ў адносінах грамадства да паўстання Хмяльніцкага актуалізавала даўнюю мяжу паміж Руссю Кароннай і Літоўскай – будучай Украінай і Беларуссю" [Сагановіч 2007: 126]. Гісторыка-культурныя адрозненні падтрымліваліся дыялектнымі адрозненнямі, якія прывялі да ўтварэння украінскай і беларускай моў.

Моўная сітуацыя ў Вялікім Княстве Літоўскім

У рамках Вялікага княства Літоўскага з самых ранніх перыядаў яго існавання вылучаліся ўкраінскія і беларускія дыялекты ў жывым гутарковым маўленні і старабеларускі і стараўкраінскі варыянты ў афіцыйна-пісьмовай мове ВКЛ – "простай мове". Адрозненні паміж гэтымі

варыянтамі абагульнены ў фундаментальным артыкуле Уладзіміра Свяжынскага *Аб статусе беларускай і ўкраінскай моў у часы Вялікага Княства Літоўскага* [Свяжынскі 2003]. Аўтар падсумоўвае ўсе адрозныя беларуска-ўкраінскія моўныя рысы і заключае:

> розныя ўмовы і вынікі фарміравання беларускай і ўкраінскай моў дазваляюць сцвярджаць, што пад вонкава падобнымі графіка-арфаграфічнымі абалонкамі і пад адной з агульных назваў "руская" ў Вялікім Княстве Літоўскім існавалі, у тым ліку і ў якасці афіцыйных, дзве ўсходнеславянскія мовы – беларуская і ўкраінская; знешняй праявай гэтага было існаванне паралельных тэкстаў, напісаных у кожным выпадку адзін – у адпаведнасці з беларускай, а другі – у адпаведнасці з украінскай пісьмовымі традыцыямі [Свяжынскі 2003: 13].

Натуральна, што ў пісьмовыя тэксты пранікалі і рысы больш дробных дыялектных аб'яднанняў. Пра гэта піша, у прыватнасці, даследчык гісторыі ўкраінскай мовы В. Русаніўскі:

> У дзелавую мову пранікалі лакальныя назвы, звязаныя з асаблівасцямі пэўных тэрыторый: *верховина* 'верхняя плынь ракі', *грунь* 'пагорак', *дидка* 'маці бацькі або маці'... [Русанівський 2001 online].

З цягам часу мясцовых элементаў у „простай мове" станавілася ўсё больш. На іх аснове пасля фармаваліся нацыянальныя ўкраінская і беларуская мовы. Сама ж афіцыйная пісьмовая мова Вялікага Княства Літоўскага ўяўляла сабой мяшаную кніжную мову, якая развілася з мясцовага варыянту ўсходнеславянскай мовы, з паступовым пранікненнем мясцовых рыс (як украінскіх, так і беларускіх), і невялікім уплывам (у параўнанні са стараўкраінскай) царкоўнаславянскай. У адрозненне ад гутарковай украінскай і беларускай моў, пісьмовая доўгі час была адзіная для ўсіх заходнерускіх земляў, так што для некаторых тэкстаў нельга сказаць, у якім рэгіёне яны напісаны. Пісьмовы інтэрдыялект адрозніваўся ад мясцовых гаворак, аднак варта адзначыць, што і ў пісьмовай мове і, вядома, у вуснай гутарковай мове Вялікага Княства Літоўскага выяўляліся дыялектныя асаблівасці, у першую чаргу раннебеларускія і раннеўкраінскія, і далей з больш дробным дыялектным чляненнем. У слоўніку Памвы Берынды (1627) "руская" мова (г. зн. "проста мова") супрацьпастаўляецца "валынскай" (г. зн. украінскай) і "літоўскай" (г. зн. беларускай): "*пѣтель*: чески, руски, *когутъ*, волынски, *пѣвенъ*, литовски, *петухъ*" [Берында 1627: 104]. „Такім чынам, «проста мова» супрацьпастаўляецца як царкоўнаславянскай мове, так і дыялектнаму украінскаму ці беларускаму маўленню" [Успенский 1994: 68].

Мова ранніх грамат Паўднёва-Заходняй Русі

Дыялектныя рысы і асаблівасці гутарковага маўлення ў найбольшай ступені прысутнічаюць у тэкстах дзелавой пісьменнасці, у першую

чаргу ў граматах. Тэрмін “грамата” вельмі шырока ўжываецца ў адносінах да ранніх усходнеславянскіх дакументаў, пачынаючы ад наўгародскіх берасцяных грамат і заканчваючы міжнароднымі дамовамі, “прывілеямі”, дарчымі і інш. Гісторыкі і спецыялісты па праву вылучаюць дагаварныя, даравальныя, статутныя, ільготныя, ахоўныя, судовыя і інш. граматы [Довнар 2015: 49].

Самыя раннія дзелавыя дакументы ўсходніх славян – дамовы рускіх князёў (Алега, Ігара, Святаслава) з Візантыяй (907, 911, 945, 971). Гэтыя дамовы першапачаткова былі напісаны на грэцкай мове, а ў перакладзе на старажытнарускую захаваліся ў складзе *Аповесці мінулых гадоў*.

Калі гаворка ідзе пра грамату ў вузкім сэнсе слова – як тып дакумента, то яе структура досыць стандартная: яна ўключае інфармацыю аб тым, хто дае грамату, далей выкладаюцца падзеі, якія сталі прычынай з'яўлення граматы, магчымае апісанне абставінаў яе з'яўлення і пералічэнне сведак.

> Мова грамат, як вядома, лепш за іншыя помнікі адлюстроўвае дыялектнае чляненне ўсходнеславянскай моўнай тэрыторыі, якое перарастае, асабліва ў XIII–XIV стст., у фарміраванне і кансалідацыю большасці характэрных рыс трох усходнеславянскіх моў [Золтан 2014: 26].

Значная частка кнігі Андраша Золтана *Даследаванні па межславянскіх моўных і культурных кантактах* прысвечаная фарміраванню моў дзелавой пісьменнасці Маскоўскай Русі і Вялікага Княства Літоўскага – вялікарускай і заходнерускай – і іх узаемаўплыву. У прыватнасці, аўтар характарызуе заходнерускую мову – афіцыйную пісьмовую мову ВКЛ (“просту мову”): этапы яе фарміравання, традыцыю, лакалізацыю варыянтаў, асаблівасці.

Падсумуем усё сказанае А. Золтанам (са спасылкай на папярэднікаў) аб ўсходнеславянскіх граматах. Моўная сітуацыя ў Кіеўскай Русі калькуе візантыйскую дыглосію літаратурнага і народна-гутарковага варыянтаў грэцкай мовы, а фармуляр старажытнарускіх грамат сфарміраваўся па ўзоры візантыйскіх прыватных актаў [Золтан 2014: 19–22]. Гэты фармуляр пазней выкарыстоўваўся ў Маскоўскай Русі. На думку аўтара, мова Вярхоўнай канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага – “простая мова” – у XIV ст. была ў працэсе станаўлення і складвалася пад уплывам дзелавой мовы Галіцка-Валынскага княства.

Пасля далучэння ў 1349 г. Галіцкай Русі да Польшчы (Валынь тады была захоплена Літвой) усходнеславянская мова становіцца адной з дзвюх (разам з лацінскай) моў польскай каралеўскай канцылярыі пры Казіміры III [Золтан 2014: 27]. Матэрыял, прыведзены ў самых ранніх галіцкіх граматах, сведчыць аб тым, што замена руска-царкоўнаславян-

скага фармуляра польска-лацінскім праходзіла тут паступова, праз стадыю суіснавання гэтых дзвюх розных традыцый [Золтан 2014: 31]. Існаванне "рускай" канцылярыі ў Польшчы, якая развілася на паўднёваўкраінскай (галіцкай) дыялектнай аснове, не магло не адбіцца і на мове літоўскіх вялікакняскіх грамат: першапачаткова ў іх пераважаюць элементы менавіта паўднёваўкраінскіх гаворак, а не рысы адной з беларускіх гаворак, як можна было чакаць; рысы беларускай мовы бяруць верх у вялікакняскіх граматах толькі ў другой палове XV ст. [Золтан 2014: 32].

На пачатку XV ст. выпрацоўваюцца нормы **афіцыйна-дзелавой мовы Вялікага Княства Літоўскага** – "простай мовы", і гэты перыяд Хрысціян Станг называе перыядам "класічнай формы літоўска-рускай мовы" [Stang 1935: 52; гл. таксама: Журавский 1978: 186–187].

"Проста мова" зусім не супадае з жывым дыялектным маўленнем, з'яўляючыся ў некаторай ступені штучным утварэннем. Саму назву "проста" ні ў якім выпадку нельга разумець літаральна, бо выраз "проста мова" ўзыходзіць да лац. *lingua rustica*, інакш кажучы, гэта кніжны па сваім паходжанні выраз. Адрозненне "простай мовы" ад дыялектнага гутарковага маўлення вельмі выразна ўсведамлялася ў Паўднёва-Заходняй Русі [гл.: Успенский 1994: 66].

А. Золтан прыводзіць пералік рыс "простай мовы" [Золтан 2014: 35–36] і заўважае:

> заходнеруская дзелавая мова ў гэты перыяд, хоць і мела ўжо даволі выразную беларускую дыялектную базу, пазбягала ўключэння ў норму тых беларускіх асаблівасцей (аканне, яканне, дзеканне), якія былі цалкам чужыя ўкраінскай мове [Золтан 2014: 37].

У прыведзеным фрагменце з кнігі А. Золтана гаворка ідзе менавіта пра мову вялікакняскай канцылярыі. Не варта, аднак, забываць, што ў асобных княствах, якія ўвайшлі пасля як у Маскоўскую, так і ў Літоўскую дзяржавы, працягваў выкарыстоўвацца старажытнарускі фармуляр грамат і ў іх паступова ўсё больш выяўляліся мясцовыя дыялектныя рысы. Такога кшталту граматы з беларускімі ці ўкраінскімі дыялектнымі рысамі з'явіліся значна раней, чым сфарміравалася афіцыйная пісьмовая мова вялікакняскай канцылярыі ВКЛ. З ранніх узораў дзелавой пісьменнасці, створаных на ўкраінскіх землях, дзве граматы ўключаны ў Галіцка-Валынскі летапіс: *Грамата князя Уладзіміра на імя брата свого Мсціслава і сваёй жонкі Вольгі*, *Грамата князя Мсціслава на ловы ад жыхароў Бярэсьця* (канчатковая рэдакцыя 1292 г.). Як вядома, Валынская частка гэтага летапісу характарызуецца менш выразным царкоўнаславянскім кампанентам і больш моцным усходнеславянскім.

В. Русаніўскі дэталёва характарызуе мову ўкраінскіх грамат, іх фармуляр і лексіку, як арыгінальную (*дисный* ʻдзейсны, актуальныʼ, *добытокъ* ʻскотʼ, ʻтаварʼ і інш.), так і запазычаную *броваръ* ʻбровар' (ст.-п. *browar*, свн. *brouwer*), *жолдъ* ʻплата наёмным ваямʼ (ст.-ч. *žołd*, ст.п. *żołd*, свн. *solt*) і інш. [Русанівський 2001 online].

Аўтар пералічвае шэраг рысаў, характэрных для грамат, напісаных на тэрыторыі сучаснай Украіны. Найбольш яркія **паказчыкі украінскіх дыялектаў** такія: на месцы этымалагічнага ѣ ўжываецца *е* або *и*; ѣ і *и* змешваюцца; этымалагічнае *е* можа перадавацца літарай *и*; замацоўваецца сярэдняе *и* (*могыла*, не *далы*); гук [ц] пераважна мяккі: *истцю, истця, околицю, о[ть]цю (і отцу), половицю, самодержець, дворець* і інш.; у першай асобе множнага ліку дзеясловаў часта выступае канчатак -*мо* нароўні з традыцыйнымі -*мъ* і -*мы*: *даємо, продаємо, слуб[о]уємо, хочемо, познаменуємо*[1]*;* з'яўляюцца сінтэтычныя формы будучага часу: *иматиму, битиму*.

Украінскія дыялектныя рысы ярка прадстаўлены ў малдаўскіх граматах, мова якіх таксама фармавалася на аснове галіцка-валынскай традыцыі, прычым тут паўднёваўкраінскія рысы былі быццам бы закансерваваныя з прычыны тэрытарыяльнай і дзяржаўнай адасобленасці. Раннія малдаўскія граматы прадстаўлены ў зборніках *Українські грамоти: XIV в. і перша половина XV вв.* (1928), *Грамоти XIV ст.* (1974) і інш.; напрыклад, *Кароль польскі Уладзіслаў пазычае ў свайго зяця, малдаўскага ваяводы Пятра, 4000 карбованцаў фряжскага срэбра, 27 жніўня 1388 г.* [*Грамоти XIV ст.* 1974: № 41]; *Пятро, малдаўскі ваевода, пасылае каралю польскаму Уладзіславу 3000 карбованцаў фряжскага срэбра, 10 лютага 1388 г.* [*Грамоти XIV ст.* 1974: № 42]. Больш поўная характарыстыка і актуальная гістарыяграфія пытання прадстаўлена, напрыклад, у працах Сяргея Суляка [Суляк 2016].

Звернемся да ранніх грамат з беларускімі моўнымі рысамі – смаленскіх грамат XIII ст. Па словах Аркадзя Жураўскага, у іх выяўляюцца самыя раннія рысы старабеларускай – "рускай" мовы, адрозныя ад царкоўнаславянскіх [Жураўскі 1993: 118].

> Смаленскія граматы з'яўляюцца выключна важнай крыніцай для лінгвістаў <…>. Лінгвістычнае іх значэнне абумоўлена перш за ўсё тым, што пры выключнай неўнармаванасці правапісу яны шырока адлюстроўваюць мясцовыя дыялектныя рысы, асабліва ў галіне фанетыкі, а таксама і марфалогіі. <…> Даследаванне правапісу смаленскіх грамат ў яго сувязі з дадзенымі гаворак Смаленшчыны і ўсходніх раёнаў Беларусі дазволіць аднавіць многія элементы фанетычнай сістэмы старажытных

[1] Як адзначае Ядвіга Казлоўская-Дода, канчатак -*мо* ў першай асобе множнага ліку цяперашняга часу дзеясловаў сустракаецца і ў беларускіх дыялектах [Kozłowska-Doda 2021: 404].

смаленскіх гаворак, высветліць іх стаўленне да заходніх гаворак рускай мовы і паўночна-усходніх гаворак Беларусі [*Смоленские грамоты* 1963: 5].

Адметныя рысы “рускай” (= старабеларускай) мовы пералічаныя Уладзімірам Анічэнкам [Анічэнка 1994: 89–90] і пазней падсумаваны У. Свяжынскім:

> Асаблівасці беларускай мовы пачалі адлюстроўвацца практычна ўжо ў першых арыгінальных тэкстах, створаных на беларускай этнічнай тэрыторыі. У гэтых адносінах асабліва цікавымі ўяўляюцца беларускія граматы. Так, ужо ў самай ранняй беларускай грамаце полацкага епіскапа 1300 г. знайшлі адлюстраванне ўсе асноўныя спецыфічныя асаблівасці, якія вылучаюць беларускую мову. У галіне фанетыкі адзначана напісанне *е* на месцы ѣ (*ехати*, *тобе*, *мне*, *у дворе*, *хотелъ*, *терпети*), адпадзенне галоснага *и* на пачатку слова (*шолъ*), пераход *е* ў *о* пасля шыпячых (*бочокъ*, *пришолъ*, *хочомъ*), пераход суфіксальнага *л* у *в* у формах дзеясловаў прошлага часу мужчынскага роду адзіночнага ліку (*оубоявся*), замена *в* на *у* ў становішчы перад зычнымі (*у витьбескъ*, *у чомъ*, *у томъ*, *улюбилъ*, *оузяти*), чаргаванне заднеязычных *г*, *к*, *х* са свісцячымі *з*, *ц*, *с* (*в Різъ)*, чоканне (змяшэнне *ч* і *ц*) – асаблівасць смаленска-полацкіх гаворак (*доконцанъ*, *мецъ*) [Свяжынскі online].

З фанетычных і марфалагічных рысаў, якія беларускія ці ўкраінскія лінгвісты называюць спецыфічнымі толькі для беларускай ці ўкраінскай моў, некаторыя на самай справе мелі больш шырокае распаўсюджанне, як, напрыклад, чаргаванне заднеязычных *г, к, х* са свісцячымі *з, ц, з* у канчатках назоўнікаў [Свяжынскі online] – вынік другой палаталізацыі, або канчаткі назоўнікаў мужчынскага роду *-ови* / *-еви* ў давальным склоне адзіночнага ліку (*господареви, жыдові*) або *-ове* / *-еве* ў назоўным склоне адзіночнага ліку (*попове*), характэрныя для праславянскай скланення назоўнікаў з асновай на *-й* [Русанивський online].

Многія з такіх рысаў агульныя для абедзвюх моў: *в* на пачатку слова паслядоўна чаргуецца з *у* / *оу* / і наадварот (*вси* – *оуси*); перад галосным *о* з’яўляецца пратэтычны *в* (*Родивон, воны*); [е] пасля шыпячых пераходзіць у [о]; вылучаецца выбухны гук [ґ], які пазначаецца на пісьме як *кг* (*кгрунт, буркгомистр*); у родным склоне адзіночнага ліку назоўнікі мужчынскага роду могуць прымаць канчатак *-у* (*листу, мёду*); назоўнікі мужчынскага роду спалучаюцца з лічэбнікамі *два, тры, чатыры* ў форме множнага ліку з канчаткам *-ы* (*-и*), суфіксальнае *л* пераходзіць у *в* у формах дзеясловаў прошлага часу мужчынскага роду адзіночнага ліку – і іншыя. Істотным з’яўляецца і пласт агульнай украінскай і беларускай лексікі, уласнай або запазычанай у XIV–XVI стст. Агульны лексічны фонд беларускай і ўкраінскай моў (гэты агульны фонд – адзін з самых значных сярод усіх славянскіх моў [Супрун 1983: 16–19]) у немалой ступені звязаны з гэтым перыядам.

Такім чынам, многія рысы тэкстаў XIV–XVI стст., якія называюць беларускімі ці ўкраінскімі, характэрныя для абедзвюх моў. Безумоўнымі беларускімі рысамі ў ранніх дакументах з'яўляецца ўжыванне *е* замест ѣ [*ехати, тобе, мне, у дворе собе, хотелъ, терпети (1300); володети (1387); обидети, на острове* (1399)] і – крыху пазней – поўнае зацвярдзенне шыпячых, *ц* і *р* [*жыто, три мѣсяцы, писаръ, рыцеръ* (1347)] [Анічэнка 1994: 90].

Больш плённай ўяўляецца дыферэнцыяцыя беларускіх і ўкраінскіх рысаў дзелавых помнікаў, якая грунтуецца на графічных асаблівасцях [Shevelov 1974: 150 і наст.; Анічэнка 1969: 49] і памылках пісцоў [Shevelov 1974: 147 і наст.].

Граматы, створаныя на тэрыторыі Беларусі і Украіны, неаднаразова выдаваліся. Аб'ёмны спіс выданняў грамат Паўднёва-Заходняй Русі прыведзены ў энцыклапедыі *Беларуская мова* [Анічэнка 1994: 91].

Раннія граматы Паўднёва-Заходняй Русі прадстаўлены ў інтэрактыўным Інтэрнэт-выданні на партале http://litopys.org.ua [гл.: *Грамоти XIV ст.* 1974], дзе няма згаданых вышэй ранніх грамат князя Уладзіміра, якія ўвайшлі ў Галіцка-Валынскі летапіс, аднак ёсць некаторыя раннія граматы літоўскіх князёў.

Як вынікае са сказанага вышэй, самымі раннімі граматамі з беларускімі моўнымі рысамі з'яўляюцца смаленскія і полацкія [гл.: *Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв.* 1977–1990, 2015; *Смоленские грамоты XIII–XIV вв.* 1963]. Што тычыцца ўласна грамат Вялікага Княства Літоўскага, то іх публікацыі ўключаюць дакументы не раней сярэдзіны – канца XIV ст., напрыклад [*Грамоты Великих князей Литовских* 1868]. Традыцыйна цікавасць да грамат ВКЛ выяўляецца менавіта з гэтага часу, гэта датычыцца і выданняў па гісторыі дзяржавы і права [гл.: *Гісторыя дзяржавы* 2003; *Дагаворы і граматы* 2000]. Пры гэтым вядомыя агульнадзяржаўныя дакументы Літоўскага княства крыху пазнейшыя за меркаваны час яго заснавання: гаворка ідзе пра граматы Міндоўга – першага князя Літоўскага княства (1230–1263) [гл.: Жлутка 2005; *Fontes historiae Magni Ducatus Lithuaniae* online]. Аўтэнтычнымі прызнаюцца не ўсе гэтыя граматы [гл.: Груша 2015: 25–26; Maleczyńsky 1936: 10–11], арыгіналы многіх з іх страчаны, аднак першая з прызнаных – дарчая грамата *Тэўтонскаму ордэну ў Інфлянтах зямлю Селонію, якая ўключае ў сябе землі Meddene, Pelone, Maleysine, Thovraxe з усім, што да іх належыць* – датуецца 1255 г. [Жлутка 2005: 28–29; *Fontes historiae Magni Ducatus Lithuaniae* online].

Граматы Вялікага Княства Літоўскага

Першыя граматы Вялікага Княства Літоўскага выклікаюць нямала пытанняў, у прыватнасці, пытанне аб тым, якая мова была прынятая

для дзелавой пісьменнасці на раннім этапе існавання княства. Граматы Міндоўга напісаны на латыні, па меры развіцця ВКЛ і далучэння новых славянскіх земляў ўсё часцей выкарыстоўвалася "проста мова".

Адным з нямногіх кірылічных дакументаў XIII ст. з'яўляецца мірная дамова паміж магістрам Лівонскага ордэна (Конрадам фон Мандэрнам) і Рыжскім гарадскім саветам, з аднаго боку, і Полацкам ды Віцебскам, з другога боку, заключаны літоўскім князем Гердзенем ў 1263 (1264) г. [*Fontes historiae Magni Ducatus Lithuaniae* online].

Перыяд з другой паловы XIII ст. да другой паловы XIV ст. кепска прадстаўлены ў пісьменстве ВКЛ – гісторыкі часта наракаюць на яго малавывучанасць. Пазней з'яўляюцца шматлікія дакументы, пісаныя кірыліцай, як унутры-, так і міждзяржаўныя, гл., напрыклад, *Князь Любарт Гедымінавіч дарує вёскі саборнай царкве Іаана Багаслова ў Луцку, 8 студзеня 1322 р.* [*Грамоти XIV ст.* 1974: № 6]; *Дамова літоўска-рускіх князёў Яўнута, Кейстута, Любарта, Юрыя Нарымонтавіча і Юрыя Карыятавіча з каралём польскім Казімірам і мазавецкімі князямі, чэрвень – верасень 1352 г.* [*Грамоти XIV ст.* 1974: №14] і інш.

На думку навукоўцаў, раннія пісьмовыя дамоўленасці (да сярэдзіны XIV ст.) у Вялікім Княстве Літоўскім былі ініцыяваныя прадстаўнікамі іншых дзяржаў і прыжыліся – асабліва падчас унутрыдзяржаўных дзелавых кантактаў – не адразу. Аляксандар Груша аналізуе дапісьменныя формы заключэння дамоваў: права "даўніна" [Груша 2015: 46–72], "дзернаватыя граматы" [Груша 2015: 28]. Аўтар піша:

> Звернемся да фактаў знаёмства Літвы з пісьмовай дакументацыяй. Нельга не заўважыць, што ўсе яны датычаць рэгулявання дыпламатычных адносін і адносін з вонкавымі інстытутамі. Гэта схіляе нас да думкі, што працэдура пісьмовага замацавання дамоваў першапачаткова навязвалася Літве звонку [Груша 2015: 27].

Падобную думку выказвае А. Золтан:

> Да уніі з Польшчай (маецца на ўвазе Крэўская унія 1385 г. – *А. Р.*) літоўская вялікакняская канцылярыя, калі наогул існавала, знаходзілася на стадыі фарміравання; захаваныя дагаварныя граматы з суседнімі дзяржавамі былі складзены ў канцылярыях гэтых дзяржаў: дамова з Польшчай 1352 г. – у "рускай" канцылярыі Казіміра III, перамір'е з Дзмітрыем Данскім 1371 г. – у Маскве [Золтан 2014: 31].

Такая выснова ўяўляецца вельмі праўдападобнай, асабліва цяпер, калі даступны корпус ранніх грамат Вялікага Княства Літоўскага: дамовы з рознамоўнымі карэспандэнтамі – краінамі або дзяржаўнымі дзеячамі – сапраўды напісаны на розных мовах: на "простай мове" (напрыклад, *Прывілей караля польскага Уладзіслава (Ягайлы) князю Літоўскаму Скіргайлу на троцкае, менскае і полацкае княжэнні*, 1387 г.

[Вішнеўскі, Юхо 2003: 35–37]), на латыні (*Акт Крэўскай уніі*, 1385 г. [Вішнеўскі, Юхо 2003: 32–34]), на нямецкай (*Літоўска-інфлянцкая мірная дамова*, 1338 г. [Вішнеўскі, Юхо 2003: 30–32]) і на польскай мовах.

Канцылярыя Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага фарміравалася паступова і стала цалкам функцыянальнай падчас кіравання Вітаўта (1392–1430). У Канцылярыі выкарыстоўваліся і візантыйска-старажытнарускі, і лацінска-польскі фармуляры; на працягу другой паловы XIV–XV стст. расло выкарыстанне "простай мовы", прычым ўстойлівыя формулы (на якія так багатыя граматы) візантыйска-старажытнарускага фармуляра паступова замяняліся перакладамі адпаведных заходніх выразаў, а ўкраінскія дыялектныя рысы, якія прыйшлі з галіцка-валынскімі ўзорамі, замяняліся беларускімі. Адно з апошніх даследаванняў знешнепалітычных грамат Вялікага Княства Літоўскага з грунтоўным аналізам, падрабязнай бібліяграфіяй і дзвюма надрукаванымі літоўска-варатынскімі граматамі гл. у працы Рамана Бяспалава і Сяргея Палехава [Бяспалаў, Палехаў 2018].

Паралельна з канца XIII ст. павялічвалася колькасць беларускіх і ўкраінскіх дыялектных элементаў у дакументах, напісаных не ў вялікакняскай канцылярыі, а пры дварах княстваў, якія паступова ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Гэтыя элементы ўліваліся ў распаўсюджаныя вялікакняскія ўзоры на "простай мове", якая развівалася, "натуралізавалася" ў зонах распаўсюджання розных дыялектаў (у тым ліку і ўкраінскіх, галіцка-валынскіх) і, дзякуючы сваёй сінкрэтычнасці, змагла прэтэндаваць на ролю агульналітаратурнай. Раннія граматы дазваляюць назіраць гэтыя рознанакіраваныя працэсы.

Заключэнне

Граматы – і дзелавое пісьменства ў цэлым – выдатны матэрыял для гісторыі штодзённасці. Пра гэта сведчаць ужо назвы грамат ў згаданых вышэй зборніках [*Грамоти XIV ст.* 1974; *Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв.* 1977–1990, 2015; *Смоленские грамоты XIII–XIV вв.* 1963; *Грамоты Великих князей Литовских* 1868 і інш.] ці ў нядаўна выдадзеных пергаментных дакументах перыяду Вялікага Княства Літоўскага з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (1391–1566): *Прадажны ліст пана Ерша Цярэшкавіча пану Пятру Манцігердавічу і яго сыну Яну на маёнтак Доўгія Шыі Луцкага павета Валынскай зямлі, 1458 г.*; *Фундушавы ліст пана Аношкі Вітонізскага і яго сыноў Андрэя і Фёдара Лаўрышаўскаму манастыру на дзве валокі сенажацей у Шчорсаўскай пушчы за ракой Нёман і палову луга Дрэваскіпішча, 1521 г.* і інш. [*Для лепшое твердости* 2018: № 3; № 14 фальсіфікат].

Паўднёва-Заходняя Русь, пры ўсёй разнастайнасці, – адзіны геаграфічны і гісторыка-культурны рэгіён. Нават самы павярхоўны агляд

грамат дадзенага рэгіёну паказвае неабходнасць іх больш глыбокага вывучэння менавіта як сукупнасці дакументаў. Такое вывучэнне прадуктыўна для вырашэння шырокага кола задач: комплексная характарыстыка шматкампанентнай моўнай сітуацыі; атрыбуцыя тэкстаў XIV–XVII стст.; этнасацыяльнае апісанне розных народаў і розных слаёў насельніцтва і інш.

Бібліяграфія

Anìčènka Uladzìmìr. 1994. *Belaruskìâ gramaty* (89–90). In: *Belaruskaâ mova. Èncyklapedyâ*. Mìnsk: Belaruskaâ Èncyklapedyâ*:* [Анічэнка Уладзімір. 1994. *Беларускія* граматы (89–90). In: *Беларуская мова. Энцыклапедыя*. Мінск: *Беларуская Энцыклапедыя*].

Bâspalaŭ Raman, Palehaŭ Sârgej. 2018. *Gìstoryâ lìtoŭska-navasìl'skìh dagavoraŭ 1427–1491 gadoŭ ì lìtoŭska-varatynskìâ gramaty 1483 ì 1488 gadoŭ*. "Belaruskì gìstaryčny aglâd" t. 25: 173–228 [Бяспалаў Раман, Палехаў Сяргей. 2018. *Гісторыя літоўска-навасільскіх дагавораў 1427–1491 гадоў і літоўска-варатынскія граматы 1483 і 1488 гадоў*. "Беларускі гістарычны агляд" т. 25: 173–22].

Berynda Pamva. 1627. *Leksikon slavenorosskij al'bo imën tolkovanie*. Kiev [Берында Памва. 1627. *Лексикон славенороссиий альбо имён толкование*. Киев].

Čigrinov Petr. 2000. *Očerki istorii Belarusi.* Minsk: Polymâ [Чигринов Петр. 2000. *Очерки истории Беларуси.* Минск: Полымя].

„Dlâ lepšoe tverdosti...»: pergamentnyâ dakumenty peryâdu Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga z fondaŭ Nacyânal'naga gìstaryčnaga arhìva Belarusì (1391–1566 gg.). 2018. Mìnsk: Belarus' [*"Для лепшое твердости...": пергаментныя дакументы перыяду Вялікага Княства Літоўскага з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (1391–1566 гг.).* 2018. Мінск: Беларусь].

Dovnar Taisiâ. 2015. *Ètapy i osobennosti v razvitii zakonodatel'stva VKL* (49–73)*. In:* Red. V. Kartašov *Aktual'nye problemy teorii i istorii pravovoï sistemy obŝestva* vyp. 14. Âroslavl' (49–73) [Довнар Таисия. 2015. *Этапы и особенности в развитии законодательства ВКЛ* . In: Ред. В. Карташов *Актуальные проблемы теории и истории правовой системы общества* вып. 14. Ярославль].

Ermalovìč Mìkola. 1989. *Pa slâdah adnago mìfa*. Mensk: Navuka ì tèhnìka [Ермаловіч Мікола. 1989. *Па слядах аднаго міфа*. Менск: Навука і тэхніка].

Ermalovìč Mìkola. 2003. *Belaruskaâ dzâržava Vâlìkae Knâstva Lìtoŭskae*. Mensk: Navuka ì tèhnìka [Ермаловіч Мікола. 2003. *Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае*. Менск: Навука і тэхніка].

Fontes historiae Magni Ducatus Lithuaniae – Istočniki po istorii Velikogo knâžestva Litovskogo i vošedših v ego sostav zemel' s drevnejših vremen do XV v. [online] http://starbel.by [доступ: 15.11.2021] [*Fontes historiae Magni Ducatus Lithuaniae* – Источники по истории Великого княжества Литовского и вошедших в его состав земель с древнейших времен до XV в.].

Galicko-Volynskaâ letopis' [online] http://lib.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4961 [доступ: 15.11.2021] [*Галицко-Волынская летопись*].

Gramoti XIV st. 1974. Kiïv: Naukova dumka [online] http://litopys.org.ua/gramxiv/grb.htm [доступ: 15.11.2021] [*Грамоти XIV ст.* 1974. Київ: Наукова думка].

Gramoty Velikih knâzej Litovskih s 1390 po 1569 god 1868. Kiev. Red. V. Antonovič, K. Kozlovskij. Kiïv: Naukova dumka [online] http://elib.shpl.ru/ru/nodes/14531-

gramoty-velikih-knyazey-litovskih-s-1390-po-1569-god-kiev-1868 [доступ: 15. 11.2021]; [online] http://litopys.org.ua/gramvkl/gra.htm [доступ: 15.11.2021]; [*Грамоты Великих князей Литовских с 1390 по 1569 год* 1868. Киев: Наукова думка. Ред. В. Антонович, К. Козловский] .

Gruša Aleksandr. 2015. *Dokumental'naâ pis'mennost' Velikogo Knâžestva Litovskogo konca XIV – pervoj treti XVI vv.* Minsk: Belaruskaâ navuka [Груша Александр. 2015. *Документальная письменность Великого Княжества Литовского конца XIV – первой трети XVI вв.* Минск: Беларуская навука].

Kozłowska-Doda Jadwiga. 2021. *Tożsamość, losy i język najstarszych mieszkańców okolic Dociszek na Białorusi* (na podstawie badań terenowych z przełomu XX i XXI w.). Lublin: Wydawnictwo Werset.

Kraŭcèvìč Ales'. 2013. *Gìstoryâ Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga*. Garodnâ-Uroclaŭ: Garadzenskaâ bìblìâtèka [Краўцэвіч Алесь. 2013. *Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага.* Гародня-Уроцлаў: Гарадзенская бібліятэка].

Maleczyńsky Karol. 1936. *W sprawie autentyczności documentów Mendoga z lat 1253–1261*. "Ateneum Vileńskie". Czasopismo naukowe poświęcone badaniom przeszłości ziem W. X. Litewskiego, r. 11: 1–60.

Pašuto Vladimir. 1959. *Obrazovanie Litovskogo gosudarstva*. Moskva: AN SSSR [Пашуто Владимир. 1959. *Образование Литовского государства.* Москва: АН СССР].

Polockie gramoty XIII – načala XVI vv. t. 2. 2015. Moskva: AN SSSR. Red. A. Horoškevič [*Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв.* т. 2. 2015. Москва: АН СССР. Ред. А. Хорошкевич].

Polockie gramoty XIII – načala XVI vv. vyp. I – V. 1977–1990. Moskva: AN SSSR. Sost. A. Horoškevič [*Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв.* вып. I – V. 1977–1990. Москва: АН СССР. Сост. А. Хорошкевич].

Povest' vremennyh let [online] http://lib2.pushkinskijdom.ru/tabid-4869 [доступ: 15.11.2021] [*Повесть временных лет*].

Rusanìvs'kij Vìtalìj. 2001. *Lìteraturna mova pìslâmongol's'koï dobi (druga polovina XIII – XVI st.)* [online] http://litopys.org.ua/rusaniv/ru04.htm [доступ: 15.11.2021] [Русанівський Віталій. 2001. *Літературна мова післямонгольської доби (друга половина XIII – XVI ст.)*].

Šabul'do Feliks. 1987. *Zemli Ûgo-Zapadnoj Rusi v sostave Velikogo knâžestva Litovskogo*. Kiev: Naukova dumka [Шабульдо Феликс. 1987. *Земли Юго-Западной Руси в составе Великого княжества Литовского.* Киев: Наукова думка].

Saganovìč Genadz'. 2007. Hmâl'nìččyna ì zemlì Belarusì. "Studia Bialorutenistyczne" № 1: 119–126 [Сагановіч Генадзь. 2007. *Хмяльніччына і землі Беларусі.* "Studia Białorutenistyczne" № 1: 119–126].

Shevelov Georg. 1974. *Byelorussian versus Ukrainian: Delimitation of Texts before A. D. 1569*. "The Journal of Belarusian Studies" vol. III, № 2: 145–156.

Smolenskie gramoty XIII–XIV vv. 1963. Moskva: AN SSSR. Red. R. Avanesov [*Смоленские грамоты XIII–XIV вв.* 1963. Москва: АН СССР. Ред. Р. Аванесов].

Stang Christian. 1935. *Die westrussische Kanzleisprache des Großfürstentums Litauen.* Oslo: I Kommisjon hos Jacob Dybwad.

Sulâk Sergej. 2016. *O âzyke slavâno-moldavskih gramot XIV–XVII vv. (k istoriografii voprosa)*. "Vestnik Tomskogo gosudarstvennogo universiteta. Filologiâ" № 4 (42): 73–96 [online] https://cyberleninka.ru/article/v/o-yazyke-slavyano-moldavskih-gramot-xiv-xvii-vv-k-istoriografii-voprosa [доступ: 15.11.2021] [Суляк Сергей. 2016. *О языке славяно-молдавских грамот XIV–XVII вв. (к историографии*

вопроса). "Вестник Томского государственного университета. Филология" № 4 (42): 73–96].

Suprun Adam. 1963. *Leksičeskaâ tipologiâ slavânskih âzykov.* Minsk: BGU [Супрун Адам. 1963. *Лексическая типология славянских языков.* Минск: БГУ.]

Svâžynskì Uladzìmìr. 2001. *Prablema ìdèntyfikacyì aficyjnaj movy Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga.* "METRICIANA: *Dasledavannì ì matèryâly Metrykì Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga*, t. I, ATHENAEUM: Commentarii Historiae et Culturae 1 (3) [online] http://kamunikat.fontel.net/www/knizki/historia/metriciana/ 01/04.htm [доступ: 15.11.2021] [Свяжынскі Уладзімір. 2001. *Праблема ідэнтыфікацыі афіцыйнай мовы Вялікага Княства Літоўскага.* "METRICIANA: *Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага*, т. I ATHENAEUM: Commentarii Historiae et Culturae 1 (3)].

Svâžynskì Uladzìmìr. 2003. *Ab statuse belaruskaj ì ŭkraìnskaj moŭ u časy Vâlìkaga knâstva Lìtoŭskaga* "METRICIANA: *Dasledavannì ì matèryâly Metrykì Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga*, t. II ATHENAEUM: Commentarii Historiae et Culturae) VIII: 132–163 [Свяжынскі Уладзімір. 2003. *Аб статусе беларускай і ўкраінскай моў у часы Вялікага княства Літоўскага.* "METRICIANA: *Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага*, т. II ATHENAEUM: Commentarii Historiae et Culturae) VIII: 132–163].

Ûgo-Zapadnye russkie knâžestva. In: Akademik. Slovari i ènciklopedii na Akademike [online] https://dic.academic.ru/dic.nsf/ruwiki/1215223 [доступ: 15.11.2021] [*Юго-Западные русские княжества.* In: *Академик. Словари и энциклопедии на Академике*].

Ûho Âzèp ì ìnš. 2000. *Dagavory ì gramaty âk krynìcy belaruskaga feadal'naga prava.* Mìnsk: BDU [Юхо Язэп і інш. 2000. *Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права*. Мінск: БДУ].

Ukraïns'kì gramoti: XIV v. ì perša polovina XV vv. t. 1. 1928. Kiïv: Z drukarnì Ukraïns'koï akademìï nauk. Red. V. Rozov [*Українські грамоти: XIV в. і перша половина XV вв.* т. 1. 1928. Київ: З друкарні *Української* академії наук. Ред. В. Розов].

Uspenskij Boris. 1994. *Kratkij očerk istorii russkogo literaturnogo âzyka (XI–XIX vv.).* Moskva: Gnozis [Успенский Борис. 1994. *Краткий очерк истории русского литературного языка (XI–XIX вв.).* Москва: Гнозис].

Vìšneŭskì Alâksej, Ûho Âzèp 2003. *Gìstoryâ dzâržavy ì prava Belarusì ŭ dakumentah ì matèryâlah.* Mìnsk: Belarus' [Вішнеўскі Аляксей, Юхо Язэп 2003. *Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах.* Мінск: Беларусь].

Zoltan Andraš. 2014. *Process formirovaniâ administrativnogo âzyka Velikogo knâžestva Litovskogo.* In: Zoltan Andraš. *Interslavica. Issledovaniâ po mežslavânskim âzykovym i kul'turnym kontaktam.* Moskva: Indrik [Золтан Андраш. 2014. *Процесс формирования административного языка Великого княжества Литовского.* In: Золтан Андраш. *Interslavica. Исследования по межславянским языковым и культурным контактам.* Москва: Индрик].

Žlutka Ales'. 2005. *Mìndaŭ, karol' Lìtovìì, u dakumentah ì svedčannâh.* Minsk: Tèhnalogìâ [Жлутка Алесь. 2005. *Міндаў, кароль Літовіі, у дакументах і сведчаннях.* Мінск: Тэхналогія].

Žuraŭskì Arkadz'. 1993. *Belaruskaâ mova.* In: *Èncyklapedyâ gìstoryì Belarusì* t. 1: 118–119. Mìnsk: Belarusì t. 1: 118–119. Mìnsk: Belaruskaâ èncyklapedyâ [Жураўскі Аркадзь. 1993. *Беларуская мова.* In: *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі* т. 1: 118–119. Мінск: Беларуская энцыклапедыя].

Žuravskiĭ Arkadij. 1978. *Delovaâ pis'mennost' v sisteme starobelorusskogo literaturnogo âzyka*. "Vostočnoslavânskoe i obŝee âzykoznanie": 185–191. Moskva [Журавский Аркадий. 1978. *Деловая письменность в системе старобелорусского литературного языка*. "Восточнославянское и общее языкознание": 185–191. Москва].

ABSTRACT: The article is devoted to a general description of the early East Slavic documents created in the Belarusian and Ukrainian territories. Such a description requires at least a brief historical and geographical commentary. The article also contains the earliest East Slavic agreements, including those where Lithuanian princes are mentioned. The first documents of the Grand Duchy of Lithuania, their structure and language are considered. The article analyzes the transition from the Greek-Byzantine model of building business documents to the Polish-Latin one. Particular attention is paid to documents written in "prosta mova", as Belarusian and Ukrainian dialectal features appeared there very early.

Keywords: agreement, template, "prosta mova", Grand Duchy of Lithuania, Rzeczpospolita.

STRESZCZENIE: Artykuł poświęcony jest ogólnemu opisowi wczesnych listów wschodnio-słowiańskich, powstałych na ziemiach białoruskich i ukraińskich. Taki opis zakłada krótki komentarz historyczny i geograficzny. W artykule omówiono najwcześniejsze dokumenty wschodniosłowiańskie, w tym te, w których wymienia się książąt litewskich. Analizowane są pierwsze umowy Wielkiego Księstwa Litewskiego, ich struktura i język. Artykuł analizuje przejście od grecko-bizantyjskich modeli budowania dokumentów biznesowych do polsko-łacińskich. Szczególną uwagę zwraca się na listy pisane „mową prostą": bardzo wcześnie natrafiają na cechy gwar białoruskich i ukraińskich.

Słowa kluczowe: umowa, formularz, "mowa prosta ", Wielkie Księstwo Litewskie, Rzeczpospolita.

РЭЗЮМЭ: Артыкул прысвечаны агульнай характарыстыцы ранніх усходнеславянскіх грамат, створаных на беларускіх і ўкраінскіх тэрыторыях. Такая характарыстыка прадугледжвае хоць бы вельмі кароткі гісторыка-геаграфічны каментар. У артыкуле прыводзяцца таксама самыя раннія ўсходнеславянскія дамовы, у тым ліку і са згадкамі пра літоўскіх князёў. Разглядаюцца першыя граматы Вялікага Княства Літоўскага, іх структура і мова. Прааналізаваны пераход ад грэцка-візантыйскіх узораў пабудовы дзелавых дакументаў да польска-лацінскіх. Асаблівая ўвага нададзена граматам на "простай мове": у іх вылучаюцца беларускія і ўкраінскія дыялектныя рысы.

Ключавыя словы: грамата, фармуляр, "проста" мова, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая.

Data przesłania artykułu: 1.12.2021
Data akceptacji artykułu: 12.12.2021

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Alena Rudenka (Алена Рудэнка) – Białoruś, badacz niezależny, dr. hab., prof.; specjalność naukowa: językoznawstwo teoretyczne i słowiańskie; zainteresowania naukowe: etnolingwistyka, semantyka językoznawcza, językoznawstwo kognitywne i komunikacyjne.

Wybrane publikacje (2020–2021):

1. Rudenka Alena, Xiang, Fang. 2020. *Names of mental illness in different languages* (120–125). In: *The Soul in the Axiosphere from an Intercultural Perspective*. Volume One. Edited by Joanna Jurewicz, Ewa Masłowska and Dorota Pazio-Wlazłowska. Part II: *The linguistic conceptualisation of the soul*. Chapter 7. Cambridge: Cambridge Scholars Publishing.
2. Rudenka Alena. 2020. *Proper Names in Ancient Smolenska Agreements with Riga* (210–221). In: *Onomastikas pētījumi II / Onomastic Investigations II. Starptautiskās zinātniskās konferences "Onomastikas pētījumi" (Rīga, 2018. gada 10.–12. maijs) rakstu krājums / Proceedings of the International Scientific Conference "Onomastic Investigations" (Rīga, May 10–12, 2018)*. Editors: L. Balode, C. Zschieschang. Rīga: LU Latviešu valodas institūts.
3. Руденко Елена. *Ранние грамоты Юго-Западной Руси* (205–218). In: *Diachronie – Ethnos – Tradition: Studien zur slawischen Sprachgeschichte*. *Festgabe für Anna Kretschmer*. Eds. Jasmina Grković-Major, Natalia B. Korina, Stefan Michael Newerkla, Fedor B. Poljakov, Svetlana M. Tolstaja. Brno: TRIBUN EU.
4. Rudenka Alena. 2020. *Polonisms among Belarusian names of cognitive processes*. "Studia Białorutenistyczne"14: 249–268.
5. Руденко Елена. 2021. *ДЕМОКРАТИЯ по материалам беларусских СМИ (середина 2020 – начало 2021 гг.)*. "Ethnolinguistics. Problems of Language and Culture" Vol 33: 39–48 [online] https://journals.umcs.pl/et/article/view/12261 [доступ: 15.11.2021].